Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# Добрушскі край

27 сакавіка 2019 года Серада

№23 (10841)

УРАДЖАЙ-2019



# Камбайн сеялцы таварыш

**Для механізатара Аляксандра Нікіценкі (на здымку злева) сёлетняя пасяўная – першая. Ён хоць і лічыць сябе вопытным работнікам – да гэтага восем год працаваў на "Амкадоры". Але падкрэслівае: пакуль знаходжуся на шляху спасціжэння сакрэтаў аграрнай справы. Галоўным лічыць адказныя адносіны да працы.**

– Пасля кожнага круга абыходжу агрэгат, папраўляю, абтрушваю зямлю. Гэта неабходна рабіць: трубкі забіваюцца, – расказвае ён.

Пакуль да працы не прыступіў яго калега, Аляксандр – адзін у полі воін. За некалькі дзён, што прайшлі з пачатку старта масавай сяўбы ў раёне, на рахунку ігаўчан – 80 гектараў пасеяных плошчаў яравых. Усяго ж пад зерневыя ў сельгаспрадпрыемстве адведзена 870 гектараў.

Механізатар працуе ў пары з... камбайнерам. Прызнацца, бачыць зернеўборачны камбайн на полі ў сакавіку нязвыкла. Аднак менавіта старэнькі КЗС-10 істотна аблегчыў працу механізатарам агракамбіната "Новы шлях". Цяпер рабочыя пазбаўлены неабходнасці самастойна загружаць зерне з мяшкоў у бункер сеялкі.

– Такі спосаб практыкуем ужо другі год запар. Дарэчы, вельмі зручна, – распавядае камбайнер Мікалай Новікаў. – Гэты камбайн – рэзервовы. Спадзяюся, летам выйду на ім у поле на ўборку зерневых. А пакуль падаю зерне ў бункер сеялкі.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

Подписка на «ДК» на II квартал 2019 года заканчивается!
газеТА, КОТОРУЮ ЛЮБЯТ

Всего 18 рублей – и три месяца газета у вас дома.

## Весткі з месцаў

### Закладзены дубравы і гаі

**Шэсць гектараў дубравы заклалі ў Шабрынскім лясніцтве.**

Як паведаміў ляснічы Мікіта Шэдаў, кварталы, адведзеныя пад лясныя волаты, высяваліся жалудамі. Каля 14 гектараў засеяны насеннем сасны. На астатніх участках выкарыстоўвалі саджанцы бярозы і хваёвых.

– На сённяшні дзень лясныя культуры высаджаны на 50 гектарах, – адзначыў спецыяліст. – Агульная плошча, адведзеная сёлета пад пасадку, складае 70 гектараў.

Адметна, што на работах па аднаўленні лясоў задзейнічаны не толькі штатныя і часовыя работнікі лясніцтва. Актыўны ўдзел у іх прымаюць прадстаўнікі райаддзела па надзвычайных сітуацыях.

**Сяргей МІХАЙЛАЎ**

### Дэбютавалі ўдала

**На фестывалі сучаснага танца "Gomel Power" поспех спадарожнічаў танцавальнаму калектыву падлеткаў "Фокс" Добрушскага гарадскога Дома культуры.**

Як адзначыла кіраўнік калектыву Настасся Чугай, падлеткі прадэманстравалі высокія майстэрства і артыстызм. Журы прысудзіла ім другое месца. Адзначаным граматай добрушскім танцорам даверана ганаровае права прадстаўляць Гомельшчыну на чацвёртым міжнародным конкурсе мастацтваў "Зорныя кветкі – 2019".

**Сяргей ВОЛЬГІН**

### Уцеўцы – за бяспеку

**Прафілактычнае мерапрыемства "Бяспечная вёска" адбылося на тэрыторыі Уцеўскага сельсавета. Яго арганізавалі работнікі райаддзела па надзвычайных сітуацыях і добрушскія прадстаўнікі таварыства Чырвонага Крыжа.**

– Удзельнікі выконвалі заданні па выкліку экстраных службаў, аказанні першай даўрачэбнай дапамогі, тушэнні пажару пярвічнымі сродкамі, установцы аўтаномнага пажарнага апавяшчальніка, – расказаў старшы інспектар групы прапаганды РАНС Яўген Хазей. – Цікавасць дарослых вяскоўцаў выклікалі таскама эвакуацыя "пацярпелага" з месца ўмоўнага здарэння, прымерка баявога адзення ратаўнікоў.

**Людміла НАЗАРАВА**

ISSN 2073-1000

## Погода

Долгота дня 12.40
Луна
27 марта — в Стрельце,
28, 29 — в Козероге

Последняя четверть 28 марта

**28 марта**
НОЧЬЮ -2…-4
ДНЕМ +4…+6
Облачно с прояснениями.
Без осадков.
Ветер с.-западный, 4-6 м/с

**29 марта**
НОЧЬЮ 0…+2
ДНЕМ +7…+9
Сплошная облачность.
Без осадков.
Ветер западный, 6-8 м/с

МОЛАДЗЬ РАЁНА

# Энтузіязм – у дапамогу

**Больш за 260 чалавек плануецца забяспечыць працай у складзе студатрадаў раённай арганізацыі БРСМ. Якія захады прымае кіраўніцтва маладзёжнай арганізацыі па фарміраванні такіх працоўных дэсантаў, даведаліся ў першага сакратара райкама БРСМ Тацццяны Савельевай.**

– Мінулагодні семестр быў не самым удалым. Удалося сфарміраваць сем атрадаў, у складзе 74 чалавек, яшчэ 51 – працаўладкаваліся індывідуальна, – расказвае кіраўнік райкама. – Сёлета сітуацыя складваецца лепш. Мяркуем нават павялічыць колькасць студатрадаў.

У райкаме БРСМ канстатуюць: такая тэндэнцыя назіраецца на працягу апошніх трох год. Напрыклад, у 2017-м працавала ўсяго два студатрады. Расце і колькасць тых, хто хоча працаваць. Зараз у райкаме вядуць прыём заявак ад моладзі раёна. Паводле анкет, рабяты жадаюць паспрабаваць свае сілы ў будаўнічай галіне, сельскай гаспадарцы, абслугоўванні, педагагічнай сферы, лясной і камунальнай гаспадарках.

– Дарэчы, менавіта лясгасы і "Добрушскі камунальнік" прадстаўляюць пераважную колькасць працоўных месцаў, – заўважае Тацццяна Савельева. – У тройцы лідараў і сельскагаспадарчы сектар.

Большасць рабят заявілі жадаемы заробак – 200 рублёў. Аднак знайшліся і тыя, хто ацаніў свае паслугі ў 500 і нават 600 рублёў. Мы запыталіся ў маладзёжнага лідара раёна, якія фінансавыя магчымасці адкрываюцца перад працоўнымі актывістамі.

– Летась штодзённы заробак складаў 5 рублёў. Рабяты працавалі чатыры гадзіны ў дзень. Той, хто не прапускаў рабочыя змены, атрымаў тое, на што разлічваў, – адказала яна.

Аналізуючы сітуацыю мінулага года, у райкаме робяць такія вывады. Амаль са стапрацэнтнай гарантыяй будуць створаны працоўныя атрады ў Жгуні, Крупцы, Цераховцы, Насовічах, Карме. Па-ранейшаму цяжка гэта будзе зрабіць там, дзе школы – базавыя.

– Неабходная колькасць дзяцей не набіраецца, – адзначае першы сакратар. – Да таго ж, існуе праблема з падвозам. Цяпер мы вырашаем пытанні з кіраўнікамі некаторых сельгаспрадпрыемстваў. Да таго ж, вядзём перамовы аб стварэнні студатрадаў на буйных прадпрыемствах горада – папяровай фабрыцы і фарфоравым заводзе.



**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота з архіва рэдакцыі**

НА СВЯЗИ

**30 марта с 9.00 до 12.00 по телефону 3-00-00**
прямую телефонную линию с жителями района проведет Тамара Викторовна СИВУХА, управляющий делами райисполкома.

* * *

**28 марта с 10.00 до 12.00 по телефону 3-13-32**
пройдет прямая телефонная линия с участием Елены Владимировны ТРУБКИНОЙ, начальника Добрушского участка почтовой связи.

ПРИЕМ

**30 марта с 8.00 до 13.00**
в кабинете №2 райисполкома прием граждан и представителей юридических лиц проведет Тамара Викторовна СИВУХА, управляющий делами райисполкома.

* * *

**30 марта с 8.00 до 14.00**
в приемной председателя райисполкома прием граждан и представителей юридических лиц проведет Александр Валерьевич ХАЗОВ, начальник отдела экономики райисполкома.

СУББОТНИК

# Наведем порядок вместе

**Первый в этом году общерайонный субботник пройдет 30 марта. В этот день на Добрушчине стартуют мероприятия по весенней уборке райцентра и сельских населенных пунктов. Его участники приведут в порядок улицы, дворы, места отдыха. Некоторые горожане и сельчане будут трудиться на рабочих местах.**

Приняв участие в субботнике, жители района тем самым смогут внести личный вклад в благоустройство города, ремонт зданий и помещений бюджетной и социальной сфер. Заработанные в день субботника средства будут также направлены на финансирование расходов, связанных с подготовкой и проведением праздничных мероприятий, включая расходы на оплату концертных программ и фейерверков.



Чтобы взять грабли и метелки, не обязательно дожидаться субботы. Инициатива жителей частного сектора заняться уборкой на придомовых территориях и улицах приветствуется в любой из этих весенних дней. В районе они пройдут под знаком наведения порядка на земле.

**Соб. инф.**
**Фото из архива «ДК»**

✓ Средства, полученные от проведения районного субботника, перечисляются до 20 мая 2019 года на специальный счет Добрушского райисполкома: BY33 AKBB 3642 4000 0905 6300 0000, открытый в ЦБУ № 309 ф-л 300 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», УНН 400006257, ОКПО 04063380, БИК: AKBBBY 21300 с обязательной пометкой: «районный субботник».

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Из убыточных – в рентабельные

**Убыточные сельхозпредприятия в Беларуси намерены вывести на рентабельную работу. Об этом Президент Александр Лукашенко заявил во время посещения молочно-товарного комплекса «Слижи» в Шкловском районе.**

Глава государства отметил, что в СМИ, особенно в российских, его поездки по сельхозпредприятиям объясняют тем, что работа по развитию отрасли не дала ожидаемых результатов и нужно принимать новые решения. «Надо понимать, что без этих убыточных хозяйств мы запросто можем жить и работать, потому что часть модернизированного сельского хозяйства дает нам полное потребление молока внутри страны и на экспорт. Поэтому мы без тех 20-25 процентов слабых хозяйств, которые у нас еще есть, вообще можем обойтись в плане производства продукции. Но там же живут наши люди, там же есть почва, земля, которую надо обрабатывать. Поэтому мы не бросаем эти хозяйства, деревни и людей, а поднимаем их», – заявил Александр Лукашенко. «Нам надо 100 процентов земли, которая находится в севообороте, поднять, создать нормальное производство, и главное люди – мы же не можем оставить их без внимания. Вот в чем смысл сегодняшних разговоров. Плюс новинка, новое что-то должно быть: новые виды продукции, импортозамещение и так далее», – добавил Президент.

**По материалам БелТА**

ЗНАЙ НАШИХ!

# Победный «Sunrise»

**На подведении итогов конкурса «Лучшие товары Республики Беларусь» Добрушский фарфоровый завод прозвучал трижды.**

Коллекция посуды для сервировки стола и подачи блюд SUNRISE стала победителем в номинации «Промышленные товары для населения и изделия народных промыслов». Ей жюри присудило также статус «Новинка года» и диплом за «Стабильное качество». К слову, таких же дипломов удостоены еще 10 организаций Гомельщины, товары которых становились лауреатами конкурса пять и более раз подряд.

При подведении окончательных итогов конкурса комиссия учитывала отзывы потребителей, поступившие в отношении организаций и их продукции и услуг. Лауреатами стали более 270 товаров, выпускаемых 175 организациями Беларуси.

**Сергей МИХАЙЛОВ**

**Оперативная информация о ходе сельхозработ**

| Наименование хозяйств | Посеяно всего яровых, зерновых и зернобобовых, га | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | задание | факт | % | в т.ч. за 25.03. | | |
| | | | | задание | факт | % |
| КСУП «Крупец» | 187 | 127 | 68 | 9 | 35 | 389 |
| КСУП «Оборона» | 554 | 200 | 36 | 36 | 30 | 83,3 |
| КСУП «Борщевский» | 236 | 175 | 74 | 6 | 5 | 83,3 |
| ОАО «Калининский» | 228 | 305 | 134 | 29 | 40 | 138 |
| ОАО «Утевское» | 206 | 130 | 63 | 9 | 18 | 200 |
| ОАО «Красная Буда» | 1060 | 120 | 11 | 80 | 30 | 37,5 |
| ОАО «Завидовское» | 405 | 290 | 72 | 14 | 40 | 286 |
| ОАО «Жгунское» | 551 | 150 | 27 | 40 | 30 | 75 |
| КСУП «Круговец» | 324 | 155 | 48 | 18 | 20 | 111 |
| КСУП «Кузьминичи» | 442 | 151 | 34 | 29 | 26 | 89,7 |
| КСУП «а/к «Новый путь» | 870 | 80 | 9,2 | 65 | 15 | 23,1 |
| Добрушский райагросервис | 392 | 12 | 3,1 | 36 | 5 | 13,9 |
| ЧСУП «Тереховка-Агро» | 895 | 35 | 3,9 | 71 | 10 | 14,1 |
| **Всего по району:** | **6350** | **1930** | **30** | **442** | **304** | **68,8** |